*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



# ТЭМА 12. ГЕОРГІЙ МАРЧУК.

1. Падрыхтуйце **мультымедыйную прэзентацыю** пра жыццёвы і творчы шлях Георгія Марчука.

2. Падрыхтуйце **паведамленне пра родны горад Г. Марчука Давыд-Гарадок** у форме віртуальнай ці завочнай экскурсіі. Растлумачце паходжанне яго назвы.

3. Напішыце і правядзіце **конкурс эсэ**, прысвечаны роднаму гораду, яго паўсядзённаму жыццю.

4. Цэласна прааналізуйце адзін з пазапраграмных канонаў Г. Марчука па наступным плане:

*1 Гісторыя напісання.*
*2 Тэматыка.*
*3 Праблематыка.*
*4 Ідэйная накіраванасць твора і яго эмацыянальны пафас.*
*5 Жанравая адметнасць твора.*
*6 Асаблівасці мастацкай вобразнасці.*
*7 Цэнтральныя персанажы (лірычны герой).*
*8 Сюжэт і асаблівасці пабудовы канфлікту.*
*9 Пейзаж, партрэт, дыялогі, маналогі персанажаў, інтэр'ер.*
*10 Моўная пабудова твора (аўтарскае апісанне, апавяданне, адступленні, разважанні).*
*11 Асаблівасці кампазіцыі.*
*12 Месца твора ў творчасці пісьменніка.*
*13 Месца твора ў гісторыі нацыянальнай літаратуры.*

5. Падрыхтуйце **даклад пра жыццё і творчасць вашага славутага пісьменніка-земляка**. Па магчымасці, правядзіце завочную экскурсію, прысвечаную яго творчасці.

6. Падрыхтуйце літаратурна-краязнаўчую карту вашай мясцовасці, на якой пазначце прозвішчы і гады нараджэння пісьменнікаў-землякоў, магчыма, іх літаратурны шлях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ